



# Гродзенскі Універсітэт

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

*№ 12 (240) 31 снежня 1996 года, аўторак*


## ПЛЁННАЙ ВАМ ПРАЦЫ!

**Л.М. КІВАЧ,**
**прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, рэктар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы**

*Вось і яшчэ адзін год адышоў у гісторыю. Для навукоўцаў, прафесарска-выкладчыцкага калектыву быў ён плённым. Мы ўдасканальвалі навучальны працэс і падрыхтоўку кадраў. Паглыблялася навукова-даследчая работа, умацоўваліся міжнародныя сувязі.*

*Сёння універсітэт - шматпрофільная навучальная ўстанова. На ўсіх формах навучання налічваецца каля 8500 студэнтаў. Тэарэтычныя і практычныя веды ім даюць 1200 выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Падрыхтоўка спецыялістаў для рэгіёнаў вядзецца па ўсіх класічных спецыяльнасцях, а таксама і па нестандартных для універсітэта - гісторыі і культуралогіі, замежных моў з вывучэннем такіх неспецыфічных дысцыплінаў, як лацінь, грэчаская, польская мовы. Два гады ўжо існуюць гэтыя факультэты, можна падвесці нейкія вынікі. Па-першае, патрэбнасць у спецыялістах вялікая, і мы будзем працягваць іх рыхтаваць, па-другое, пераканаліся, што гэта справа нам пад сілу.*

*Апраўдала сябе і аб'яднанне двух факультэтаў у адзін -фізіка-тэхнічны. Асобна хачу сказаць аб факультэце педагогікі і псіхалогіі. Гэта таксама некласічны факультэт. Побач з падрыхтоўкай кадраў для пачатковых школ цяпер займаемся і падрыхтоўкай псіхолагаў для школьных устаноў усіх тыпаў, для прамысловых прадпрыемстваў, органаў МУС. Бурна развіваецца факультэт права і эканомікі. Тут упершыню адкрыўся савет па абароне дысертацый. Пачало працаваць аддзяленне міжнародных эканамічных адносін. Зазначу, што цяпер працуе савет па абароне дысертацый на матэматычным факультэце.*

*Універсітэт працуе ў галіне навуковых даследаванняў па некалькіх міжнародных праектах. У ліку трох еўрапейскіх універсітэтаў атрымалі грант на развіццё навукі. Навуковыя накірун-*

**(Заканчэнне на 3 стар.).**

## ЦЫТАТА НУМАРА:

***"Пачатак ёсць палавіна ўсяго".***
***Піфагор.***




# З НОВЫМ ГОДАМ!

## ***
## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

Студзень багаты на юбілеі. Мы віншуем юбіляраў і нагадваем, калі і каго могуць павіншаваць калегі, сябры, студэнты.

* 1 студзеня - *Наталлю Валянцінаўну* ***БАБАРЫКА*** - інжынера навуковага аддзела.

* 1 студзеня - *Сабіну Антонаўну* ***САЎЦА*** - прыбіральшчыцу.

* 2 студзеня - *Аляксандру Уладзіміраўну* ***ПЛАТОНАВУ*** - лабаранта кафедры радыёфізікі і электронікі.

* 2 студзеня - *Марыяну Іванаўну* ***КАРАБАНАВУ*** - прыбіральшчыцу.

* 5 студзеня - *Ганну Баляславаўну* ***КАЖАНЕЎСКУЮ*** - старшага выкладчыка кафедры тэорыі і методыкі музыкальнай адукацыі.

* 7 студзеня - *Алену Сямёнаўну* ***ЗЕРКІНУ*** - выкладчыка кафедры замежных моў.

* 12 студзеня - *Вольгу Міхайлаўну* ***ДАРОШКА*** - намесніка дэкана факультэта фізічнага выхавання, дацэнта кафедры педагогікі.

* 13 студзеня - *Лілію Іосіфаўну* ***СТАШКЕВІЧ*** - загадчыцу інтэрната № 3.

* 16 студзеня - *Веру Іванаўну* ***ШАЛУХА*** - мастака.

* 17 студзеня - *Надзею Трафімаўну* ***ОСІПАВУ*** - касіра.

* 22 студзеня - *Галіну Францаўну* ***МАСЛОЎСКУЮ*** - старшага выкладчыка кафедры педагогікі пачатковай школы.

* 28 студзеня - *Ніну Сяргееўну* ***ІВАНЧАНКА*** - загадчыцу лабараторыі матэрыялазнаўства і рэсурсазберагаючых тэхналогій.

* 28 студзеня - *Ніну Васільеўну* ***КАРМАНАВУ*** - дзяжурную інтэрната № 2.

* * *

## "Наднёманскія галасы"

Сардэчна віншуюць студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта з Новым годам! Шчыра зычаць усім шматкратнага памнажэння жыццёвых сілаў, бадзёрасці і святочнага настрою:

*З пушыстым сняжком і прамяным марозцам*
*Хай святы сустрэнуць і горад, і вёска!*
*Хай пах навагодняй ялінкі калматай*
*У кожную хату прыходзіць са святам!*
*І, колькі іскрынак у покрыве снежным,*
*Няхай загарыцца шчаслівых усмешак!*

## Ад шчырага сэрца

Віншуем з Новым годам нашага любімага дэкана Генадзя Аляксеевіча Гачко і ўсіх выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашага факультэта. Жадаем моцнага здароўя, шчасця, поспехаў, міру і дабрабыту ў сям'і.

*Студэнты 1 гр. III курса*
*фізіка-тэхнічнага факультэта.*

## З удзячнасцю і цяплом

Год 1996 для мяне - шчаслівы і адметны. Бо збылася мая мара: я стала студэнткай.

Сёння хачу звярнуцца са словамі ўдзячнасці да выкладчыкаў, з якімі звёў лёс на ФДП (я паступіла якраз дзякуючы гэтаму факультэту). Асабліва добры след пакінулі сустрэчы з Марыяй Ігнацьеўнай Кукраш, выкладчыкам фізікі.

Віншую з Новым годам М.І. Кукраш, а таксама ўсіх нашых выкладчыкаў. Шчасця вам!

*Ю. НЕХАВА,*
*студэнтка 4 групы I курса*
*фізіка-тэхнічнага факультэта.*

# ПЛЁННАЙ ВАМ ПРАЦЫ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.).

*кі ахопліваюць многія галіны, фінансуюцца яны з розных крыніц, у тым ліку і з Еўрапейскіх міжнародных фондаў. Вынік - прызнанне універсітэта вядучым у галіне навукі. З ліку 560 выкладчыкаў 32 прафесары, 24 маюць доктарскую ступень.*

*Сёння універсітэт мае сваю лакальную камп'ютарную сістэму, выхад у сістэму ІНТЭРНЕТ.*

*На базе універсітэта пачынаюць працаваць навуковыя ўстановы новага тыпу. Адкрыты ліцэй, фізіка-тэхнічны каледж, неўзабаве пачнуць працаваць педагагічны і юрыдычны каледжы, плануем адкрыццё каледжа эканамічнай адукацыі. Ёсць праект стварэння тэхнапарку, які дасць магчымасць удзельнічаць у рэканструкцыі эканомікі, арганізацыі навукаёмкай вытворчасці.*

*На жаль, дзяржава сёння - не шчодры Дзед-Мароз, які направа-налева раздае падарункі. Кішэнь у яе цяпер дзіравы, таму мы павінны вучыцца зарабляць грошы. Напрацоўкі ў гэтым напрамку ёсць. У мінулым навучальным годзе 20 працэнтаў бюджэтных сродкаў было зароблена калектывам. Сёлета гэтая лічба складае ўжо 30 працэнтаў. 2320 студэнтаў навучаюцца па платнай форме, у асноўным на факультэтах права і эканомікі, педагогікі і псіхалогіі і замежных моў.*

*Сёння задача прафесарска-выкладчыцкага калектыву не толькі ў тым, каб даць студэнтам глыбокія тэарэтычныя веды. Не менш важна дапамагчы будучым спецыялістам знайсці сваё месца ў жыцці ў наш такі няпросты час. Кожны студэнт павінен асэнсаваць, што ён стане галоўнай дзеючай асобай у эканоміцы і культуры рэспублікі ў XXI стагоддзі.*

*Што робіцца для нашых студэнтаў у сацыяльным плане? Большасць іншагародніх забяспечаны інтэрнатам, за пражыванне плацяць сімвалічную суму. Універсітэт набыў для аздараўлення базу ў санаторыі "Радон". Плануем такую ж базу набыць і ў санаторыі "Парэчча". Дзейнічаюць праграмы па масавым аздараўленні студэнтаў. Ёсць стадыён, корты, трэнажорныя залы. Матэрыяльны стан студэнтаў у наступным годзе павінен палепшыцца: указам Прэзідэнта павялічваюцца стыпендыі.*

*Для адпачынку моладзі, для развіцця талентаў і здольнасцяў створаны факультэт грамадскіх прафесій, дзейнічаюць клубы па інтарэсах.*

*Універсітэт жыве паўнакроўным, цікавым разнабаковым жыццём і ў новым годзе мяняць гэты рытм не збіраецца. Маем неблагія напрацоўкі і цікавыя планы. А каб іх ажыццявіць, патрэбна працаваць штодзённа. Хачу пажадаць калектыву моцнага здароўя, асабістага шчасця, поспехаў у навуцы і вучобе.*

*З Новым годам Вас!*

# Быць аптымістам



**ЛІ ЧОН КУ,**

***прафесар, намеснік дэкана факультэта права і эканомікі па падрыхтоўцы эканамічных кадраў***

У 1996 годзе адбыўся першы выпуск нашых студэнтаў па спецыяльнасці "Міжнародныя эканамічныя адносіны". Радуе тое, што ўсе яны знайшлі работу. Гэта і дзяржаўныя прадпрыемствы, такія, як вытворчае аб'яднанне "Азот", і камерцыйныя структуры. Прыйшліся да спадобы нашы выпускнікі ў Комплексбанку, Беларусбанку. Яны прайшлі праз сур'ёзную канкурэнцыю, адбор, - і вытрымалі! Некаторыя выпускнікі працягваюць вучобу: два чалавекі паступілі ў аспірантуру, яшчэ двое - у вышэйшую школу КДБ.

Што засмучае? Дысцыпліна студэнтаў. А яшчэ - мяне з сям'ёй выселілі з інтэрната, які належыць заводу аўтамагнітолаў. Жыву цяпер нелегальна.

Чаго чакаю? Кватэры. І не толькі. Трэба не губляць аптымізму нават у самых складаных сітуацыях...



# Павел КРЫШАЛОВІЧ:
# "МЫ ЖЫВЕМ У СВОЙ ЧАС..."

Імя Паўла Крышаловіча добра вядома на фізіка-тэхнічным факультэце. Ён вучыцца на чацвёртым курсе. Ужо другі год атрымлівае Сорасаўскі грант. Працуе ў выдавецкім аддзеле універсітэта. Удзельнічае, і даволі актыўна, у грамадскім жыцці факультэта. Сціплы, сур'ёзны, і разам з тым няўрымслівы і апантаны, гэты юнак ужо сёння мае ўсе задаткі, каб сказаць сваё слова ў навуцы. Сам ён лічыць, што ў кожнага з нас ёсць здольнасці. Але, каб стаць сабой, патрэбна працаваць. Прапаноўваем вашай увазе запіс размовы нашага карэспандэнта з П. Крышаловічам.

**- Кажуць, што здольнасці, талент, геніяльнасць перадаюцца з малаком маці з пакалення ў пакаленне. А старраннасць у вучобе дасягаецца калі не бацькавай дзягай, то мацярынскай увагай, падрыхтоўкай урокаў усёй сям'ёй. Як было ў вас?**

- Сям'я самая звычайная. Бацька працуе электрыкам, а маці была фельчарам на станцыі "хуткай дапамогі". Частыя начныя дзяжурствы не дазвалялі ёй рабіць з намі ўрокі. Мы са старэйшым братам Юрыем раслі даволі самастойнымі хлопцамі. Але, вядома ж, да працы нас прызвычаілі змалку. Як і Юрый, я паступіў у фізіка-матэматычную школу-ліцэй №1, вучыўся там выдатна. Наогул, прыклад брата вельмі моцна паўплываў на мой выбар. Ён з чырвоным дыпломам скончыў універсітэт, а зараз... служыць у войску, ну, а мне, як малодшаму, яго слава дапамагае вучыцца. Часта, асабліва на першым курсе, пыталіся: а Юрый Крышаловіч часам не радня табе? Гэта не толькі дапамагала, але і абавязвала. Не хацелася парушаць сямейную традыцыю: калі вучыцца дык ужо вучыцца добра. Так вось і стаў атрымліваць Сорасаўскі грант...

**- Як удаецца спалучаць работу, вучобу, захапленні - дарэчы, падрабязней аб апошніх...**

- Усё спалучаецца арганічна, таму што ўсё вельмі цікава. Раней займаўся, як, бадай, кожны ў маім узросце, спортам - грэка-рымскай барацьбой. Маляваў. Казалі, што атрымлівалася нядрэнна... На работу ў выдавецкі аддзел я пайшоў, каб быць бліжэй да камп'ютара. І захапіўся вёрсткай, афармленнем выданняў. На камп'ютары можна тварыць цуды. Вучобе гэта не перашкаджае. Дарэчы, пара займацца сур'ёзнай навуковай дзейнасцю. Працую над курсавой работай, вельмі цікавая тэма: "Распрацоўка праграмы аўтаматызаванага лабараторнага практыкуму па тэме "элекрамагнетызм"...

**- Што ты яшчэ можаш сказаць пра сябе?**

-Толькі добрае. Дрэннае і без мяне скажуць.

**- Павел, як ты ставішся да грошай?**

- "Студэнт" - гэта гучыць горда, а "стыпендыя" - гэта заўсёды мала. Каб атрымліваць Сорасаўскі грант, трэба кожны раз даваць справаздачу аб навуковай працы. Што я зрабіў у гэтым плане? Удзельнічаў у студэнцкіх рэспубліканскіх канферэнцыях па фізіцы кандэнсаваных асяроддзяў. Разам з Андрэем Сянкевічам пад кіраўніцтвам выкладчыкаў распрацоўвалі тэмы па камп'ютарным мадэляванні.

**- Твае адносіны да рэлігіі...**

- Я не абвяргаю, не маю права абвяргаць Бога. У душы ёсць нейкая вера ў духоўнасць, у высокае. Без гэтага цяпер, напэўна, нельга. Нельга і сказаць, што мы жывем у цяжкі час. Мы жывем якраз у свой час.

**- Ці ёсць у цябе дзяўчына?**

- Ёсць. Але не хапае часу на развіццё адносінаў. У асноўным трымаем сувязь па тэлефоне. Як далей будзе - час пакажа.

**- Калі ты пачаў задумвацца аб будучым?**

- Неяк і не заўважыў, калі пераступіў мяжу дзяцінства. Адчуў, што трэба спадзявацца толькі на сябе, ніхто нічога мне не дасць, ды і не абавязаны даваць. Трэба будаваць свой плацдарм. Кожны нармальны чалавек павінен задумвацца аб заўтрашнім дні і аб сваім месцы ў жыцці. І як мага раней, калі яшчэ не позна змяніць нешта ў сваіх звычках, патрабаваннях.

**- Які ў вас курс, як складваюцца адносіны з выкладчыкамі, што робіце пасля заняткаў?**

- Наш курс жыве вельмі паўнакроўна. Ёсць студэнты з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, добрыя арганізатары, такія, як Вадзім Аніська, Ігар Кунцэвіч. Займаемся самадзейнасцю, выступаем паспяхова. Праўда, калектыў мужчынскі пакуль што. З выкладчыкамі ў нас зносіны добрыя. Калі-нікалі спрачаемся свабодна, амаль на роўных. Большасць жа вельмі адданыя сваёй справе, фізіцы. З імі вельмі цікава. А першай, хто прабудзіў цікавасць да навукі, была мая школьная настаўніца, класны кіраўнік Наталля Георгіеўна Андзялевіч. Заўсёды яе буду помніць...

*Л. ДАНІЛАВА.*

*Фота Ул. Сарокіна.*



# СВЯТА МАСТАЦКАГА СЛОВА І ШЧЫРЫ ДЫЯЛОГ

**Пятро МАЛЯЎКА,**
**кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы**

Напачатку было слова... Але крышачку заранёў праявіла сябе адвечная, адшліфаваная стагоддзямі, традыцыя ветлівасці і пашаны: хлеб-соль дарагім і чаканым гасцям - пісьменнікам са сталічнага града Менска ад студэнтаў і выкладчыкаў філалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Не так часта надараюцца такія сустрэчы. Не так часта наш “правінцыйны” цэнтр адорваюць сваёй увагай майстры мастацкага слова, хто ад нараджэння надзелены талентам - божым дарам - слухаць час, наперад як бы прадбачыць і прадказваць, што нас чакае заўтра, якімі мы будзем.

А пагэтаму кожнае такое спатканне, кожная такая сустрэча інакш як свята не ўспрымаецца. І на самай справе гэта сталася Святам Слова, Святам Дыялогу, Святам паразумення душаў і сэрцаў.

І ўсё ж напачатку было слова... своеасаблівы запеў - вітанне першаму намесніку старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіміру Андрэевічу Паўлаву, намесніку Віктару Пятровічу Супрунчуку, члену-карэспандэнту, літаратурнаму крытыку Уладзіміру Васільевічу Гніламёдаву на роднай матчынай беларускай мове прысутныя пачулі з вуснаў рэктара універсітэта Леаніда Мікалаевіча Ківача. Словы шчырай удзячнасці і дабрыні, што адклікнуліся на запрашэнне, адшукалі магчымасць прыехаць, каб у непасрэдным кантакце, у сумленным дыялогу са студэнтамі і выкладчыкамі паразважаць, падзяліцца думкамі пра дзень сённяшні, пра светлае і шэрае, пра добрае і набалелае, каб здароўя хапіла на доўгія гады для сур'ёзнай творчай працы на ніве мастацкай літаратуры, ад якой мы, чытачы, атрымлівалі б вялікае духоўнае і эстэтычнае задавальненне.

Шчырыя словы, сказаныя рэктарам, нейк непасрэдна перадаліся добразычлівым настроем усім прысутным. Перадаліся яны і загадчыку кафедры беларускай літаратуры Мікалаю Уладзіміравічу Мікулічу, які вёў сустрэчу, яго калегам, якія шмат папрацавалі, каб сапраўды гэта спатканне сталася святам, ды якім Святам!

Прынамсі кафедра была ініцыятарам Свята Слова, яшчэ адным пробным каменьчыкам да самасцвярджэння, да самавыяўлення яе творчых магчымасцяў. І, не перабольшваючы, пазначым, што ўсё атрымалася найлепшым чынам. Тым больш, што гэта спрацоўвалася не для ілюстрацыйнасці, малюнкавасці, паказнасці, не з-за нейкай эгаістычнай зацікаўленасці, а з усведамленнем, што можам, умеем, і, дай Бог, не спынімся на дасягнутым, на паўдарозе. А колькі яшчэ наперадзе задуманага, яшчэ поўнасцю не прапрацаванага, але такога жаданага - час пакажа - ўвасаблення ў жыццё. Спадзяёмся, што так і станецца...



Свята... Гэта заўважалася і па тварах студэнтаў. Неабыякавымі, нераўнадушнымі яны былі як у зале, так і на сцэне. Адчувалася, быццам нейкая ўнутраная сіла сабірала, падрыхтоўвала, скіроўвала, прываражвала іх да сябе, каб праз нейкае імгненне выбухнуць назапашанай дабрачыннай энергіяй уважлівых вачэй, шчодрых сэрцаў, праўдзівых слоў. І яшчэ... Нейк падспудна прамільгнула думка, што калі не ўсе яны, то ва ўсякім разе большасць прыйшлі сюды не са звычайным “трэба”, а па закліку душы ў даўно чаканае, прымроенае, неаднойчы бачанае ў снах. Прыйшлі, каб увачавідкі ўпэўніцца, пераканаць сябе раз і назаўсёды, што мастацкае слова - цуд, што мастацтва словам - нешта загадкавае, таямнічае, што мкне да сябе з сілаю зямнога прыцягнення. Прыйшлі, каб стацца жывымі непасрэднымі ўдзельнікамі свята-спектаклю з усімі яго атрыбутамі, свята жывога дыялогу сцэны і залы, свята, якое памяць зберажэ і пранясе праз усё жыццё.

Свята шчодрасці і дабрыні, праўдзівасці і сумленнасці. Не маглі не запасці, не крануць душы гасцей, не наталіць іх сэрцы прыемнай асалодай прывітальныя словы студэнцкай грамады: музычны ўступ, вершаваныя радкі-прысвячэнні, поўныя гумару і дабрыні, павагі і шчырасці, а разам з імі і прачытанні на памяць вершаў Ул. Паўлава са зборніка “Што было на Беларусі?”, інсцэніроўка апавядання В. Супрунчука “Вегетарыянец”, выступы ў ролі мастацкага крытыка (чым усё сваё творчае жыццё “грашыць” Ул. Гніламёдаў), узяўшы за ўзор байку Кандрата Крапівы “Дзед і Баба”, патлумачыўшы “пераканаўча” яе змест, характары, мастацка-выяўленчыя сродкі з розных пунктаў погляду (з'ява гэтая вельмі надзённая, і не толькі ў літаратуры мы з ёй сустракаемся).

Лагодны гумар, артыстычнасць, трапнасць, дакладнасць роднага слова “падкуплялі”, “заварожвалі” не толькі пісьменнікаў, але і ўсіх прысутных. А гваздзікі з рук гасцей самадзейным артыстам -хіба ж гэта не сведчыла, што “дапяклі”, “прабралі да касцей”, так “зачапілі за жывое”, так “уважылі” (у добрым сэнсе слова), што заставацца ім у ролі вольных назіральнікаў і слухачоў аніяк не прыстала, ды і нікуды ўжо не дзецца ад запытанняў-запісак надзвычай уважлівай аўдыторыі.

Як вядома, след пракладае першы, больш вопытны, з багатай жыццёвай практыкай. Вельмі спакойна, упэўнена “падставіўся” ў творчы дыялог Ул. Паўлаў. Без хібаў і нагрувашчванняў, без напышлівай дыдактыкі, а неназойліва, уважліва, з даверам да прысутных распачаў ён жывую гутарку, сур'ёзны дыялог з адказаў на няпростыя пытанні з асабістага жыцця: як і калі напісаўся першы верш? Ці веруючы Вы чалавек? Адчуваеце Вы сябе яскравай індывідуальнасцю, ці Вы чалавек з натоўпу? Ад чаго залежыць лірычны настрой у таго, хто піша вершы?

Мяккасць, тактоўнасць, сур'ёзнасць разам з гумарам вельмі цёпла ўспрымаліся прысутнымі. Бачылася, адчувалася, што паэт не толькі шчыры да няпростага, але і да дробязяў (на першы погляд) ставіўся праўдзіва, уражваючы аўдыторыю шчырасцю і сумленнасцю мастацкага слова, цвёрдасцю грамадзянскай пазіцыі. Хочацца верыць, што не засталіся па-за ўвагай словы пісьменніка пачынаючым: “Хто бярэцца за пяро - не шкадуйце сябе ў маладосці! Любі, калі любіцца; цалуй, калі цалуецца! І заўсёды са шчырасцю, з радасцю, з жаданнем абняць жыццё. Дзеля гэтага мы на зямлю прыходзім. А яшчэ - каб тварыць, тварыць на карысць Радзіме, народу, зберагаючы і аберагаючы святое: мову матчыную, чалавечую годнасць і сумленнасць, адвечнае дрэва роду свайго. Каб падчас увішнага малення не награшыць для новых пакаленняў, бо свеціць і пячэ зорка-бяда Чарнобыля, з якой адна ў змаганні Беларусь”. А колькі адкрылася тым, хто сабраўся, у прачулых, папярэджальных радках:

Глядзіце, браццы, каб было не позна

Глядзець, як беларусы паміраюць!

І кожны наступны верш, прачытаны самім аўтарам, заўважалася, цверазіў, цверазіў, рэанімаваў душы і сэрцы ад штодзённага чужога пахмелля, ад бяспамяцтва, ад забыцця, прымушаючы ўспомніць імя

сваё. А як сцішыліся і задумаліся, напружыліся і загарэліся ўсе адначасова пасля прачытання верша "Народ, пачуй!" Якой горкай праўдай выспавядаліся словы Янкі Купалы, узятыя да твора ў якасці эпіграфа:

Роднага краю тутэйшыя людзі
Лезуць у шкуру чужую жыўцом...

Як яны падсвяціліся, патлумачыліся заключнымі радкамі верша, акрэсліўшы трагедыйнасць нашай сённяшняй рэчаіснасці:

Плод без зярняці - не плод.
І без мовы - насельніцтва, не народ!

У такт старэйшаму калегу па пяру "спавядаўся" перад прысутнымі празаік В. Супрунчук. Ён быў больш лаканічным у адказах на запытанні. Аднак прастору для роздуму, для разважання і ўсведамлення кожнае слова - адказ давала бязмежную. Варта толькі занатаваць невялікі дыялог, каб у гэтым упэўніцца:

- Спадчына беларускай літаратуры XX стагоддзя?
- Выдатная!
- Ці верыце Вы ў Бога?
- Адносна.
- У якіх умовах любіце працаваць?
- У любых.
- Крыніца Вашага натхнення?
- Зямля, прырода.
- Ці ёсць непрыгожыя жанчыны?
- Для нармальнага мужчыны непрыгожых жанчын няма!..
- Вашая мара?
- Каб Беларусь, нарэшце, стала сапраўды незалежнай дзяржавай!
- У чым бачыце сэнс жыцця?
- Напісаць сапраўдную кнігу пад назовам "Тапінамбур"!?

Да спадобы прысутным прыйшлося і алегарычнае апавяданне аўтара, усім сваім зместам скіраванае на нашу сённяшнюю рэчаіснасць. Гумар і роздум, трывога і боль за веліч нашую спалучыліся ў ім з надзеяй на лепшае. Тут будуць да месца, не памылімся, наступныя крылатыя радкі: "нават пасля доўгай і суровай зімы, але ўсё ж прыходзіць бурная і цёплая вясна".

Нельга не ўлавіць пераклічку, сугучнасць іх з адказам на адно з пытанняў Ул. Гніламёдавым: "Хай нас не пакіне надзея..."

Яму, намесніку дырэктара інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларусі прыйшлося, магчыма, найцяжэй. Ведаючы яго як вядомага літаратуразнаўцу і таленавітага крытыка, які апошнім часам вельмі плённа працуе над спадчынай народнага песняра Янкі Купалы і праблемамі развіцця сучаснай беларускай паэзіі, удзячная аўдыторыя не скупілася ў пытаннях, і не толькі ў плане асабістага жыцця. Шаноўнаму членкору, доктару філалагічных навук даваліся прачытаць амаль цэлую лекцыю, "вытрымаць" свайго роду экзамен на важкасць і доказнасць напрацаванага ім. Даводзіў ён свае думкі не спяшаючыся, ведаючы цану кожнаму сказанаму слову, сказанаму крытыкам: "Што сёння ўсе мы - крытыкі жыцця. Больш таго, крытык сёння не можа задаволіцца падзелам на "добра" і "дрэнна" пры прачытанні не толькі высокамастацкіх твораў, але і "вучнёўскіх", тых, хто толькі ступіў на гэтую сцяжыну і робіць па ёй першыя крокі. Тут варта кіравацца правілам, сфармуляваным аднойчы Янам Каменскім: "Каб той, каго ты вучыш, не заўважаў таго, што ты вучыш?" Гэта свайго роду талент, які разам з тым патрабуе і выключнай чуйнасці слова, і заўважнасці яшчэ на падыходзе драбнічак, празначак геніяльнасці ў будучым. Як важна не памыліцца, не падсекчы, а, наадварот, падтрымаць, падставіць плячо сябра, папраўляючы, неназойліва патлумачваючы, як трэба, і чаму".

Імпанавала прысутным, асабліва пачынаючым паэтам, як ён далікатна, тактоўна ставіцца да напісанага маладымі аўтарамі, што ў кожным з іх ён бачыць Арфея, а разам з тым і іх першасныя, яшчэ неакрэпўлыя спробы знайсці сябе ў ім. Што ж датычыцца паэзіі дваццаць першага стагоддзя і якой яна будзе, крытык не прыхаваўся ў завуаліраваных хадах, а адказаў адназначна: "Паэзія - таямніца. Яна была і будзе заўсёды, як быў і заўсёды будзе Янка Купала. Гэта такая Глыбіня, а творчасць яго - сапраўдная Беларуская Біблія для народу нашага, якому б яшчэ такога мудрага дзяржаўцу, як Вітаўт Вялікі".

Яшчэ і яшчэ раз пераконваемся, што праўдзівае, сумленнае слова абуджае дух, лечыць зняверaных, распраўляе ім крылы, а мы - не выключэнне, каб разам з усімі добрымі людзьмі зямлі лячыцца да зор, да Сонца.

І яшчэ... Без сумніву сустрэча з пісьменнікамі запамятаецца як неардынарная сустрэча з Мастацкім Словам і як Сумленны Шчыры Дыялог.

Пабольш бы такіх сустрэч...



# ВЫХОД В INTERNET,

## или ШТРИХИ К ПОРТРЕТУ СТУДЕНТА, КОТОРЫЙ ИГРАЕТ НА ФОРТЕПЬЯНО

**А. КРУШЕЛЬНИЦКИЙ,**
**заместитель декана математического факультета по воспитательной работе**

Первокурсник математического факультета Андрей Бабкин прошедший год считает для себя успешным. В уходящем году он стал победителем школьного конкурса по проекту "Building sister schools linkages", что позволило ему в январе-феврале 1996 г. проходить стажировку во Флориде (США). Принял участие в работе 1-ой Республиканской научной конференции школьников, где получил диплом III ступени за разработанную программу. В марте получил первую премию в конкурсе "Ученик города", а в мае стал победителем Республиканского конкурса "Юный программист" и олимпиады по математике ГрГУ им. Янки Купалы.

Школу-гимназию №30 закончил с золотой медалью. Успешно представлял Республику Беларусь на Международной конференции I*EARN's "Интернет в образовании" в Будапеште (Венгрия) и был зачислен в университет. Вот такой богатый на события год для Андрея.



Еще обучаясь в гимназии, Андрей проявлял осознанное стремление к исследовательской работе в области информатики и математики. А сейчас вполне успешно адаптируется к новым условиям в университете.

Впрочем, лучше всего характеризуют Андрея его педагоги. Преподаватели информатики школы-гимназии №30 г. Гродно Л.М. Ровба и Б.Г. Курмыза, рекомендуя своего ученика для получения гранта, отмечают: "Бабкин Андрей проявляет неординарные способности и склонности к научно-исследовательской работе в области математики и компьютерных технологий... Обладает огромными возможностями памяти".

А вот мнение директора школы-гимназии №30, кандидата педагогических наук Р.И. Мсжджер: "Для Андрея характерны стремление самостоятельно углублять знания, широкая эрудиция".

Довольна своим воспитанником и кандидат педагогических наук, зам. декана математического факультета, доцент Н.П. Макарова. Причем она отмечает не только способности студента в области информатики и математики. Оказывается, Андрей изучает два иностранных языка - английский и немецкий, играет на фортепьяно, серьезно занимается легкой атлетикой.

Недавно в нашем университете проходил Республиканский школа-семинар "Физика и компьютер". Участники семинара проявили интерес к программе, разработанной Андреем. В чем актуальность этой программы?

- Моя программа, - рассказывает А.Бабкин, - это имитатор-тренажер PCPTEACH. Позволяет овладеть навыками практической работы с электронной почтой с максимальной степенью приближения к реальной работе в Internet.

Актуальность программы сегодня очевидна: компьютерные телекоммуникации позволяют обеспечить выход в мировое информационное пространство, но работа в Internet требует определенных умений и практических навыков. Реальная работа с электронной почтой - дорогостоящее дело. А с помощью моей программы можно вести групповое, индивидуальное обучение, имитируя реальный процесс.

- Андрей, вы представляли свою программу на международной конференции в Венгрии. Как прошла презентация там?

- Интерес проявлен был большой не только к программе и ко мне, единственному представителю Республики Беларусь. Меня забросали вопросами о нашей системе образования, о Гродно, нашем университете. Вопросы были самые неожиданные. Например, спросили, где я так хорошо изучил английский язык. Были очень удивлены тому, что английскому языку я обучался в школе Беларуси, а не в каком-либо европейском колледже.

Скоро у Андрея первая в жизни студенческая сессия. Пусть она будет успешной для него, для всех первокурсников.

***На снимке: Андрей Бабкин.***



# А ЯК У ІХ?

Мінулы год быў багаты на дзелавыя візіты, аб чым ужо наша газета паведамляла. Але асобна хочацца расказаць аб сустрэчы гродзенцаў з гасцямі з універсітэта Варвіка (Англія) Кэці Чарльтан і Розмары Стэмп.

На гэту сустрэчу з нашага боку прыйшлі рэктар, прарэктары універсітэта, дэканы і загадчыкі асноўных аддзелаў. Госці расказалі аб кіраванні адукацыяй і сувязях з установамі, якія рыхтуюць моладзь для вну: школьнымі каледжамі, ліцэямі і г.д.

К. Чарльтан коратка расказала аб універсітэтах і сістэме кіравання імі ў Англіі. Там універсітэты дзеляцца як бы на дзве катэгорыі: хартыйныя, якія існуюць яшчэ з XIX - пачатку XX стагоддзя і заснаваны ў свой час каралеўскай хартыяй, і новыя, якія сталі з'яўляцца ў 90-х гадах. Дзейнасць першых, да якіх адносіцца і універсітэт Варвіка, вызначае хартыя, кіруюцца яны складанай сістэмай камітэтаў і камісій, а вышэйшым органам кіравання з'яўляецца прэзідыум. Яму падпарадкоўваецца Савет, Савету - сенат, затым - факультэт кіравання і, нарэшце, асамблея, якая дзейнічае накшталт нашага агульнага сходу калектыву: мае права даваць рэкамендацыі, уносіць прапановы.

Тыя ж універсітэты, якія былі створаны нядаўна, - распавядала спадарыня Чарльтан, маюць статут універсітэта і кіруюцца віцэ-канцлерам.

Цікавым было выступленне і другой госці - Р. Стэмп.

- Універсітэт Варвіка,- сказала яна, - арганізуе маркетынгавую дзейнасць. Мы прапагандуем свае адукацыйныя праграмы. Без маркетынгавай дзейнасці нельга: прыкладна 200 навучальных устаноў прапаноўваюць аналагічныя паслугі, і нам даводзіцца літаральна змагацца за кожнага студэнта.

Асабістая функцыя дырэктара аддзела сувязяў са школай і каледжам Р. Стэмп - гэта прамежкавая сувязь паміж універсітэтам і тымі, хто хоча паступіць, з іх бацькамі, саветнікамі па працаўладкаванні. Ёсць прадстаўнікі маркетынгавай дзейнасці на факультэтах, кафедрах. Аддзел мае інфармацыю аб тэндэнцыях на рынках адукацыі, і гэта дапамагае ў рабоце. Немалаважнае значэнне універсітэт Варвіка надае якасці і разнастайнасці навучальных праграм. У дасягненні мэты выкарыстоўваюцца імідж і рэпутацыя універсітэта. А мэта - прыцягнуць і затрымаць студэнта ў рамках універсітэта, каб быць упэўненым у мэтазгоднасці фінансавання.

Універсітэт Варвіка мае базу дадзеных, якая дапамагае прасачыць шлях кожнага студэнта праз увесь працэс навучання і яго працаўладкаванне. Дарэчы, студэнты занепакоены тым, ці атрымаюць яны работу пасля заканчэння вучобы. "Гэта моцна адрознівае англійскіх студэнтаў ад вашых", - сказала Р. Стэмп.

Пытанні, якія задавалі гасцям гаспадары, тычыліся навучальнага працэсу, кіравання, фінансавання. Размова атрымалася жывой і цікавай дзякуючы добраму перакладу начальніка аддзела міжнародных сувязяў І.Б. Захарчанкі.

К. Чарльтан і Р. Стэмп сустракаліся таксама і са студэнтамі.

## ДЗЕЛАВЫЯ ВІЗІТЫ

Багатай на кантакты з замежнымі калегамі была першая дэкада снежня. Нашы навукоўцы пабывалі ва універсітэтах Італіі, Англіі, Францыі. Наша газета паведамляла ўжо аб маючых адбыцца паездках і іх мэтах. Усе візіты прайшлі па плану, былі вельмі карыснымі і цікавымі.

У Швецыі пабывалі рэктар універсітэта Л.М. Ківач і дэкан факультэта педагогікі і псіхалогіі В.П. Таранцей. Яны пазнаёміліся са Стакгольмскім універсітэтам, з сістэмай яго кіравання, работай па падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў, а таксама распрацавалі некалькі праектаў сумеснай работы.

*Пытайцеся - адказваем*

# ХОЧАШ У САРБОНУ?

Разам з усталяваннем міжнародных адносін у галіне навукі сталі даволі частымі дзелавыя візіты прадстаўнікоў замежных універсітэтаў. Да нас наведваліся італьянцы з універсітэта Турына, англічане з Варвіка. Нагадваем, што Гродзенскі універсітэт разам з двума вышэй названымі атрымаў грант на развіццё навукі, і зараз ідзе работа па абмене вопытам, знаёмству, наладжваецца больш цеснае супрацоўніцтва.

Міжнародныя сувязі шырока асвятляюцца ў друку, практыкуюцца сустрэчы гасцей са студэнтамі. Усё гэта абуджае вялікі інтарэс у студэнцкай моладзі да жыцця замежных равеснікаў. На некаторыя пытанні студэнты хацелі б атрымаць адказы праз газету. Наш карэспандэнт звярнуўся да начальніка аддзела міжнародных сувязяў І.Б. Захарчанкі.

**- Ігар Барысавіч, ці маглі б нашы студэнты вучыцца за мяжой? Што для гэтага патрэбна?**

- Праблемаў няма. Былі б жаданне і адпаведная падрыхтоўка. Трэба адпавядаць патрабаванням той навучальнай установы, куды наладзіўся паступаць. Вытрымай экзамены, напрыклад, ва універсітэт Варвіка на англійскай мове - і ты студэнт. Але трэба мець на навучанне $ 10 000 ды пару тысяч у месяц на пражыванне...

**- А як там праходзяць уступныя экзамены? Ці вялікі конкурс?**

- Конкурс - прыкладна 25 чалавек на адно месца. Адзін абітурыент падае заяву адразу ў чатыры навучальныя ўстановы, потым выбірае, куды ён будзе трымаць экзамены, экзамены здаюцца для атрымання фінансавання.

**- Чым адрозніваецца якасць навучання ў нас і за мяжой? Ці зможа наш выпускнік працаваць, напрыклад, у Англіі і наадварот?**

- Вучоба нідзе не даецца лёгка. Патрабаванні сур'ёзныя ўсюды. І там могуць адлічыць студэнта за непаспяховасць альбо непрыстойныя паводзіны. А вось наконт спецыялістаў... Наш матэматык, напэўна, зможа працаваць за мяжой і замежны матэматык у нас - таксама. Што тычыцца іншых спецыяльнасцяў, то... Уявіце сабе на нашым заводзе праграміста з Захаду: няма работы, няма зарплаты. Не, не зможа замежны спецыяліст у нас. І наш наўрад ці вытрымае той тэмп, тыя патрабаванні, што прад'яўляюцца за мяжой...

**- Што Вы можаце пажадаць тым студэнтам, што зацікавіліся замежжам?**

- З пункту гледжання здаровага сэнсу, наўрад ці ёсць неабходнасць ехаць вучыцца за мяжу. Але гэта магчыма. Што пажадаць? Упартасці і настырства ў авалоданні ведамі студэнтам, калегам - цярпення і мудрасці, усім - здароўя і шчасця.

# КАМІСІЯ ДЗЕЙНІЧАЕ

У нашым універсітэце створана новая камісія па правапарушэннях. Узначальвае яе прарэктар па вучэбнай рабоце І.П. Мартынаў. Неабходнасць стварэння такой камісіі выклікана тым, што апошнім часам павялічылася колькасць правапарушэнняў сярод студэнтаў і нават выкладчыкаў.

Адбылося першае пасяджэнне камісіі, вынікам якой стаў загад рэктара аб пакаранні правапарушальнікаў. Магчыма, многія бачылі копію гэтага загаду на дошцы аб'яў. У ім гаварылася, што за грубыя парушэнні правілаў унутранага распарадку ў студэнцкім інтэрнаце N 2 студэнты чацвёртага курса факультэта права і эканомікі (МЭА) Бардзюкоў А., Самойлік Д., студэнт гуманітарнага факультэта (МЭА) Лубянько Д. адлічваюцца з універсітэта, а студэнты Русак А., Гайдукевіч А., Война Д., Кулікоў А., таксама з 4 курса гуманітарнага факультэта, пазбаўлены права пражывання ў інтэрнаце. Студэнту 4 курса гуманітарнага факультэта Сехіну А. аб'яўлена строгая вымова, а студэнтам Анціпіну А., Бойка Ю., Красачка А., Шушко А. з другога курса факультэта права і эканомікі (МЭА) аб'яўлена вымова.

Можа, і нявартa было б псаваць святочны настрой такімі навінамі, але жыццё вымушае нас замагацца з бездухоўнасцю. Вядома, шкада адлічваць студэнта з чацвёртага курса. А калі ён заслугоўвае гэтага пакарання? У чытача, вядома, узнікне пытанне: а чым жа вызначыліся гэтыя хлопцы? Адкажам. Вышэйназваныя правапарушальнікі ў студэнцкім інтэрнаце №2, што па вуліцы Даватара, учынілі п'яную разборку. Утаймаваць іх па-добраму не ўдалося. Нанесены матэрыяльныя страты інтэрнату: выламаны дзверы, выбіты вокны...

Цяпер арганізатары разборкі ўжо не з'яўляюцца студэнтамі. А тыя, каму на першы раз даравалі, павінны моцна задумацца.

Калі гэты нумар газеты рыхтаваўся да друку, адбылося яшчэ адно пасяджэнне камісіі. Работа па ўмацаванні дысцыпліны сярод студэнтаў набывае сістэматычнасць і паслядоўнасць. Аб гэтым павінны ведаць тыя, хто не супраць "гульнуць" у інтэрнаце ці па-за яго сценамі. Вынікі не прымусяць доўга чакаць.

*Слова - выпускнікам*

# ПАМЯТАЮ, ЗАЙЗДРОШЧУ

*Л. ШЧАРБЯНОК,*
*выпускніца 1980 года,*
*выкладчык інстытута ўдасканалення настаўнікаў г. Гродна*

Як хутка ляціць час! Не паспееш азірнуцца - ужо на календары 1997 год, канец стагоддзя. Пачынаеш разумець, што трэба спяшацца, каб паспець многае.

Я скончыла універсітэт у 1980 годзе. Тады ён рабіў першыя крокі як універсітэт. Шмат чаго змянілася за гэтыя гады. Але нязменнай, бадай, засталася прага да ведаў у студэнтаў і жаданне падзяліцца імі - у выкладчыкаў.

Калі бываю ва універсітэце, заўсёды наведваю свой родны фізіка-тэхнічны факультэт. Як змяніліся его кафедры! Асабліва шмат новага абсталявання на кафедрах лазернай фізікі і спектраскапіі, радыёфізікі і электронікі. Ды і на ўсіх факультэтах камп'ютары, дысплейныя кабінеты. Цікавей вучыцца сённяшнім студэнтам.

Пасля размеркавання многія выпускнікі трапяць у сельскія школы, дзе матэрыяльная база слабейшая. І як спатрэбяцца тыя веды, што вы атрымліваеце ў аўдыторыях, лабараторыях. Там наўрад ці хто дасць добрую параду. Таму, дарагія студэнты, імкніцеся да ведаў сёння, не губляйце магчымасць пашыраць свой кругазор. Я нават зайздрошчу тым, хто вучыцца сёння: больш магчымасцяў зведаць новае.

Я адразу пасля заканчэння універсітэта атрымала накіраванне ў сярэднюю школу № 13 г. Гродна і працавала там 16 гадоў. Цяпер - у інстытуце ўдасканалення настаўнікаў. Магчыма, мы і сустрэнемся з вамі некалі ў гэтым інстытуце. Мы праводзім курсы павышэння кваліфікацыі для настаўнікаў фізікі прыкладна 3-4 разы ў год. Гэта выклікана тым, што навука не стаіць на месцы, з'яўляюцца новыя тэхналогіі, новая аснашчанасць. А далёка не кожная школа можа сабе дазволіць набыць усю сучасную аргтэхніку. Вось і знаёмяцца сельскія фізікі з навінкамі ў нас. Дарэчы, у нашым інстытуце працуюць выкладчыкі універсітэта, запрашаем спецыялістаў са сталіцы, іншых гарадоў.

Але самую трывалую першапачатковую базу, якая потым дазволіць удасканальваць свае веды, можна атрымаць ва універсітэце. Таму жадаю студэнтам поспехаў, "пяцёрак" у залікоўках, вясёлай маладосці. Удзячна сваім настаўнікам-прафесарам, дактарам і кандыдатам фізіка-тэхнічных навук, выкладчыкам, проста шчырым і добрым людзям, з якімі звёў лёс у сценах універсітэта. Здароўя Вам і доўгіх шчаслівых гадоў!

## ГАТУЕМ СМАЧНА

***Прапануем вашай увазе некалькі рэцэптаў прыгатавання закусак да святочнага стала.***

### САЛАТА "МІМОЗА"

Узяць па 200 г зваранай гароднiны: бульбы, буракоў, морквы, 30 г салёных або марынаваных агуркоў, 100 г цыбулі, 5 крутых яек, баначку маянэзу.

Гародніну наскрыляць на бураковай або сырнай тарцы, цыбулю дробна нарэзаць, яйкі церці на дробнай тарцы. Пры жаданні ўсё, акрамя агуркоў, можна асобна злёгку прысаліць і пасыпаць перцам. Падрыхтаваную гародніну падзяліць на тры часткі. Узяць сподак адпаведнага памеру, пакласці на яго трэцюю частку гародніны слаямі - бульбу, цыбулю, агуркі, бурак, моркву, заліць трэцяй часткай маянэзу. Такім жа чынам пакласці яшчэ дзве трэціх часткі гародніны, перакладваючы маянэзам. Бакі салатавай горкі абсыпаць пацёртымі бялкамі, а верх - жаўткамі і ўпрыгожыць галінкамі пятрушкі ці сельдэрэю. Перад тым, як падаць на стол, салату нарэзаць як торт, на талеркі лепш за ўсё класці лапаткай для торту, каб слаі салаты не перамяшаліся. Смачней ад гэтага не стане, але знешні выгляд, згадзіцеся, немалаважная дэталь.

### РЫБА, ЗАПЕЧАНАЯ З БУЛЬБАЙ

Рыбу пачысціць, прамыць, парэзаць на кавалкі, пасаліць, пасыпаць перцам, абваляць мукой і пакласці на патэльню, змазаную маслам. Паміж кавалкамі рыбы пакласці сырую бульбу, парэзаную долькамі, і 1-2 лаўровых лісткі. Пасыпаць рыбу дробна нарэзанай цыбуляй, спырснуць маслам, падліць на патэльню шклянку вады альбо бульёну і паставіць запякаць у гарачую духоўку.

### СВІНІНА "АПЕТЫТНАЯ"

Прадукты: 500 г свініны, галоўка цыбулі, 4 сталовыя лыжкі мукі, соль, перац і іншыя прыправы па густу.

Свініну (пажадана грудзінку цэлым кавалкам) заліць 1,5 л халоднай вады, дадаць спецыі, цыбулю і паставіць варыць да мяккасці. Затым мяса дастаць, аддзяліць ад касцей, нарэзаць невялікімі кубікамі. Бульён працадзіць. Муку развесці невялікай колькасцю халоднага бульёну, паставіць на агонь і, бесперапынна перамешваючы, выліць увесь астатак бульёну. Лішняй колькасці вадкасці даць выкіпець. Пакласці кавалачкі мяса і ўсё разам зноў гатаваць. Можна ў гатовую ўжо страву дадаць тамат-пюрэ, гарчыцу (па 1 сталовай лыжцы) і адзін салёны агурок.

Падаць з толькі што спечанымі блінамі, якія мачаюць у соус з мясам. Хлеба не трэба.

*СПОРТ*



# АСІЛКІ З АЎДЫТОРЫЙ

***В. МАКСІМОВІЧ,***
***дацэнт кафедры фізічнага выхавання, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь***

*Незадоўга да новага года універсітэт абляцела радасная вестка: наш студэнт Аляксандр Сідарэнка стаў чэмпіёнам свету па грэка-рымскай барацьбе. Мы папрасілі расказаць аб спаборніцтвах трэнера Вячаслава Аляксандравіча Максімовіча. Нагадаем, што В.А. Максімовіч - дацэнт, загадчык кафедры фізвыхавання, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца і трэнерам зборнай каманды краіны.*

Гэта быў першы чэмпіянат свету па грэка-рымскай барацьбе сярод студэнтаў. Наша каманда ў складзе 6 чалавек сустрэлася ў Тэгеране з такімі моцнымі сапернікамі, як каманды Турцыі, Карэі, Японіі, Ірана. Вельмі напружаная канкурэнцыя, тым больш, што ў гэтых камандах было па 10 спартсменаў. Але ўсе члены нашай нацыянальнай зборнай мелі ўжо вопыт міжнародных спаборніцтваў. Хлопцы ведалі, чаго ад іх чакаюць, і, вядома, гэта надавала ім сілы. Усе шасцёра выйшлі ў фінал. Атрымалі чатыры залатыя, два сярэбраныя медалі, агульнакаманднае трэцяе месца.

Спаборніцтвы былі вельмі маляўніча афармлены. Цікавай і насычанай была культурная праграма. Там вельмі шмат славутых мясцін. Асаблівае ўражанне пакінула наведванне палаца шаха. І наогул, Іран - ісламская краіна, усё падпарадкавана законам Карану. Чатыры разы ў дзень усе павінны маліцца. Так было, дарэчы, і на спаборніцтвах.

Для Сашы ж гэты год быў наогул напружаны: ён жа алімпіец, чэмпіён Рэспублікі Беларусь. І ў Тэгеране застаўся верным сабе. У яго вагавай катэгорыі была вельмі напружаная, вострая канкурэнцыя. Ён выйграў паядынак з палякам Фафінскім і заваяваў залаты медаль. Нагадаю, што Аляксандр - студэнт пятага курса факультэта фізвыхавання.

Наогул год прайшоўшы быў для нашых спартсменаў добры: выйгралі чэмпіянат Рэспублікі, Кубак Беларусі, на чэмпіянаце Еўропы выступілі паспяхова, заваявалі тры ліцэнзіі на ўдзел у Алімпіядзе, ну, і, вядома, у Атланце выступілі добра - чацвёртае месца, сярэбраны і бронзавы медалі. І фініш года - чэмпіянат свету ў Іране, пра які ішла гаворка вышэй - таксама цудоўны.

А непакояць мяне, як і ўсіх нас, напэўна, агульначалавечыя праблемы. Хацелася б, каб стабілізаваліся эканоміка і палітыка, каб можна было спакойна працаваць. Што датычыць вышэйшай школы, дык хацелася б, каб работнікі яе сапраўды адпавядалі назве вышэйшай. Гэта пачынаецца з забеспячэння тэхнічнымі сродкамі, інфармацыяй, каб кожны работнік вышэйшай школы верыў у заўтрашні дзень і ведаў, што яго прафесійны ўзровень забяспечыць яму нармальнае жыццё, каб можна было спакойна ўдасканальваць свае прафесійныя навыкі і аддаваць студэнтам свае веды і вопыт.

Для нас пачынаецца новы алімпійскі цыкл. У Гродне ў студзені будзе праходзіць чэмпіянат Рэспублікі. Ужо дзесяць чалавек выехалі ў Стайкі на зборы. Ёсць шмат перспектыўных спартсменаў, з якімі трэба працаваць. Вельмі радуе, што ва універсітэце склаўся такі спрыяльны мікраклімат і добрыя адносіны да развіцця фізкультуры і спорту. Гэта дапамагае нашым спартсменам раскрыць свой талент і праявіць сябе на чэмпіянатах.



***На здымку: чэмпіён свету па грэка-рымскай барацьбе, студэнт 5 курса факультэта фізічнага выхавання Аляксандр Сідарэнка.***



*Галерея "Тизенгауз"*

## НА ВЫСТАВКУ ПОЙДЕМ?

Перед вами “Автопортрет”Ивана Русачека, представленный на выставке в галерее “Тизенгауз”, где сейчас показывают свои работы студенты нашего университета с отделения искусств.



Серьезная, но приглушенная авторская интонация звучит в “рефлектирующем” образе художника, как и в другой его работе - ”Натюрморте с атрибутами искусств”. Портрет выполнен сангиной. Известно, что прежде чем браться за этот материал, надо научиться хорошо рисовать простым карандашом, потому что техника работы сангиной непроста. Иван решает рисунок в живописно-эскизной манере, что делает портрет особенно выразительным. Он передает настроение затаенно переживаемого конфликта.



Наряду с красочными фантазиями Наташи Костевич, драматичной живописью Инны Аполониной, офортом Оксаны Коршун и линогравюрами Ольги Олейниковой и Александра Яськова невозможно не заметить композиции Андрея Филипповича. Именно они привносят в экспозицию живописно-декоративный эффект, приятно радующий глаз: входящий зритель сразу видит прекрасно оформленный, звучный по цвету натюрморт, таящий в себе какое-то особенно предпраздничное настроение. Ясный конструктивный замысел, чистота форм, уместность цвета и экономия средств - все присутствует в этой, на первый взгляд, простой работе, которая вполне может рассматриваться как оригинальное художественное произведение.

***Н. АНТОНЧИК,***
*искусствовед.*

***На снимках:** “Автопортрет” И. Русачека; композиция “Коложская церковь” А. Яськова.*

*Фото В. Сорокина.*

*По Усходнім календары*

## ГОД БЫКА (БУЙВАЛА)

Згодна з календаром, прынятым у Японіі і другіх краінах Усходу, у рамках 12-гадовага цыклу кожны год праходзіць пад знакам нейкай жывёліны. Чалавек, які нарадзіўся ў той ці іншы год, атрымлівае шэраг прыроджаных якасцяў, у залежнасці ад якіх і складваецца яго лёс.

Буйвал (Бык) (1925, 1937, 1949, 1961, 1973, 1985). Гэтыя людзі цярплівыя, маўклівыя, выклікаюць давер. Аднак часам яны могуць быць і эксцэнтрычнымі, лёгка выходзіць з сябе. У гэтыя моманты іх варта асцерагацца - лютасць быка не ведае межаў. Звычайна маўклівыя, у моманты захаплення бываюць красамоўнымі. Валодаюць цудоўнымі разумовымі і фізічнымі дадзенымі. Лічацца людзьмі лёгкага характару, але пры гэтым часта праяўляюць упартасць - не любяць супярэчнасцяў. Некаторыя з іх глядзяць на каханне як на спорт, што вядзе да непаразуменняў з блізкімі.

А якім будзе год Вогненнага Буйвала для іншых?

Самога Буйвала сёлета чакаюць поспех і шчасце, выйгрышы і ўмацаванне здароўя.

Певень паспяхова пераадолее ўсе перашкоды.

Конь пражыве год добра.

Свінні патрэбна быць гатовай да ўсялякіх нечаканасцяў.

Тыгру, Дракону і Казе лепш нічога важнага не распачынаць, магчымы страты.

У Малпы ўзнікне маса дробных непрыемнасцяў, грашовыя страты.

Для Ката гэты год будзе часам выпрабаванняў.

Сабацы няварта рызыкаваць, арганізоўваючы таямнічыя загаворы.

Мыш пражыве год спакойна, выкарыстоўваючы свае мінулагоднія запасы.

Для Гадзюкі год здасца інэртным. Яна спакойна перачакае, калі ўсё ўтрасецца і арганізуецца.

## ДУМКІ ЎСЛЫХ

*ВНУ - месца, дзе выкладчыкі патрабуюць ад студэнта ведаў па ўсіх дысцыплінах, у той час як самі ведаюць толькі па адной.

*Сатыра падымае людзей на барацьбу: толькі адных супраць недахопаў, а другіх - супраць сатырыкаў.

*- Чулі, нейкі хлопец знайшоў за горадам міну?

- Так, чутна было вельмі добра!

## СМЕХА-ПАНА-РАМА




### З ПІСЬМАЎ

*Мяне абклалі налогам - мясам і яйкамі.

*Яна змазала мяне па сківаці так, што ў мяне пачаўся масавы падзёж зубоў.

*Я жыву з мужам, як Ганна Карэніна: не распісана і не прапісана.

### ФРАЗЫ

*Калі ўзровень жабрацтва гарантаваны, больш упэўнена глядзіш у будучыню!

*Эвалюцыя: ад росквіту застою да застою росквіту.

*Калі будучыня за намі, значыць, мы не апошнія.

*Выкарыстаны гумарыстычныя выданні перыёдыкі блізкага і далёкага замежжа.*

## АНЕКДОТЫ

Шэрлак Холмс і доктар Ватсан заначавалі за горадам, у палатцы.

Уначы Ватсан будзіць Холмса і паказвае ўверх:

- Сэр, аб чым вам гаворыць гэтае сузор'е?
- Ні аб чым. А вам?
- Аб тым, што ў нас укралі палатку.

* * *

Ноччу стук у дзверы.

- Хто там?
- Адкрывай, пагаварыць трэба.
- А колькі вас?
- Двое.
- Ну, вось і пагаварыце.

* * *

Пецька і Васіль Іванавіч едуць на цягніку. Васіль Іванавіч пытаецца:

- Ты якія дровы ў топку кідаеш?
- Прамыя.
- Кідай крывыя, зараз скіроўваць будзем.

* * *

Ідуць рускі і японец па вуліцы. Бачаць - чарга. Японец пытаецца:

- Што гэта такое?

Рускі адказвае:

- Гэта ў нас яблыкі выкінулі.

Японец схадзіў, паглядзеў, вяртаецца:

- Так, у нас такія таксама выкідваюць.

* * *

Габравец пытаецца ў жонкі:

- Што ты хацела б атрымаць у падарунак на Новы год?
- Не ведаю.
- Добра, даю табе на роздум яшчэ адзін год.

* * *

Навагодняя раніца.

- Куды ідзеш?
- Я шукаю кватэру.
- Як, у цябе няма кватэры?
- Ёсць, але не памятаю, дзе...

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.

*Рэдактар* **Л.ДАНІЛАВА.**
*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, Ю.РАДС.**

Газета выходзіць адзін раз у месяц.
Аб'ём - 1 друк. арк.

*Здадзена ў набор 18.12.96*
*Заказ № 89*
*Наклад 500 асобнікаў.*

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас: г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 72-08-17.*